# МІЖРЭСПУБЛІКАНСКІЯ АДНОСІНЫ Ў СССР НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАЛІТЫКІ САВЕЦКІХ АРМЕНІІ І АЗЕРБАЙДЖАНА Ў ДАЧЫНЕННІ ДА КУРДАЎ

**А. А. Пабеданосцава-Кая**

*Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*Універсітэцкая наб., 11, 199034, Санкт-Пецярбург, Расійская Федэрацыя,*
*apobedonostseva@gmail.com*

Савецкая палітыка пазітыўнай дыскрымінацыі ў дачыненні да розных этнічных груп з пачатку 1920-х гг. прыйвяла да з'яўлення унутры СССР разнастайных аўтаномных нацыянальных утварэнняў, пачынаючы з найбольш развітых аўтаномных адзінак – саюзных рэспублік, якія мелі многія атрыбуты незалежных дзяржаў. Дадзены артыкул прысвечаны суперніцтву Арменіі і Азербайджанам вакол вызначэння савецкай палітыкі у дачыненні да курдскага насельніцтва.

***Ключавыя словы*:** курды; Курдыстан; Арменія; Азербайджан; СССР; нацыянальнае будаўніцтва.

# МЕЖРЕСПУБЛИКАНСКИЕ ОТНОШЕНИЯ В СССР НА ПРИМЕРЕ ПОЛИТИКИ СОВЕТСКИХ АРМЕНИИ И АЗЕРБАЙДЖАНА В ОТНОШЕНИИ КУРДОВ

**А.О. Победоносцева-Кая**

*Санкт-Петербургский государственный университет,*
*Университетская наб., 11, 199034, Санкт-Петербург, Российская Федерация,*
*apobedonostseva@gmail.com*

Советская политика позитивной дискриминации по отношению к различным этническим группам с начала 1920-хх гг. привела к появлению внутри СССР разнообразных автономных национальных формирований, начиная с наиболее развитых автономных единиц – союзных республик, которые имели многие атрибуты независимых государств. Данная статья посвящена соперничеству Армении и Азербайджана вокруг определения советской политики в отношении курдского населения.

***Ключевые слова:*** курды; Курдистан; Армения; Азербайджан; СССР, национальное строительство.

# RELATIONS AMONG SOVIET REPUBLICS: THE CASE OF COMPETITION BETWEEN SOVIET ARMENIA AND AZERBAIJAN OVER SOVIET KURDISH PROJECTS

**A. O. Pobedonostseva-Kaya**

*Saint-Petersburg State University, Universitetskaya emb., 11,*
*199034, St.Petersburg, Russian Federation, apobedonostseva@gmail.com*

The Soviet affirmative action policies towards various ethnic groups since the early 1920s resulted in the emergence of various autonomous entities inside the USSR – beginning with the most developed units — Union republics which possessed many features of independent states. The paper shall focus on the Armenian and Azerbaijan Soviet competitive efforts to shape Soviet policies towards the Kurdish population.

***Keywords*: Kurds; Kurdistan; Armenia; Azerbaijan; USSR; nation-building.**

Адыб Халід і Геро Фэдтке звярнулі ўвагу на неабходнасць больш дакладнага вызначэння дзейных сілаў у савецкай гісторыі, у прыватнасці важных нецэнтральных актараў, напрыклад саміх этнічных груп, ў савецкіх нацыянальных праектах [1; 2]. Гэтае даследаванне развівае іх падыход, паказваючы ролю іншых нецэнтральных актараў – саюзных рэспублік – у кшталтаванні палітыкі датычна нацменшасцяў, што жылі на іх тэрыторыі. Гэтая роля застаецца дагэтуль малавывучанай, бо даследчыкі засяроджваюцца на ролі маскоўскага, саюзнага кіраўніцтва, адсоўваючы рэспубліканскія ўлады на другі план. У артыкуле разглядаецца канкурэнцыя паміж армянскай і азербайджанскай савецкімі рэспублікамі за магчымасць уплываць на савецкую палітыку ў дачыненні да курдскага насельніцтва ў 1920-1950-х гг.

Курдскае насельніцтва СССР было расцярушана па Каўказе і Цэнтральнай Азіі і падзялялася на тры групы – езідаў Арменіі і Грузіі, курдаў-мусульман (шыітаў) Азербайджана і курдаў-мусульман (сунітаў) Туркменістана і часткова Арменіі і Грузіі. Улады Савецкай Арменіі першымі выявілі цікавасць да курдаў на сваёй тэрыторыі, якія былі збольшага езідамі. Тым самым яны працягнулі традыцыі армянскіх нацыяналістаў, якія з сярэдзіны XIX ст. [3] выказвалі сімпатыі да езідаў, спрабавалі з імі супрацоўнічаць і разглядалі іх асобна ад лаяльных асманскім уладам курдаў-мусульман.

Як толькі была створаная савецкая армянская дзяржаўнасць, улады актывізавалі спробы інтэграваць езідаў у армянскае грамадства, заахвочваючы езідаў сяліцца ў Савецкай Арменіі [4, с. 9]. Іншым прыкметным захадам Ерэвана была спроба ўкараніць – у рамках агульнасаюзнай палітыкі барацьбы з непісьменнасцю – новастворны курдскі алфавіт на аснове армянскай пісьмовасці. Гэта было зроблена адразу пасля таго як Арменія стала савецкай рэспублікай у 1921 г.

Палітыка Ерэвана неўзабаве сутыкнулася з пазіцыяй цэнтральных савецкіх уладаў. яны  абапіраліся на ўласную экспертную базу, а таксама акадэмічныя і палітычныя цэнтры, якім было афіцыйна даручана распрацоўваць нацыянальную палітыку, у прыватнасці Інстытут мовы і мыслення Мікалая Марра. Разгледзеўшы вынікі даследаванняў і прытрымліваючыся свайго азначэння нацыянальнасці, Інстытут зрабіў афіцыйную

выснову, што езіды ёсць часткай курдскага народа [5, л. 5-5 (об)], што не зашкодзіла армянскаму істэблішменту працягваць спробы дамагчыся перагляду гэткай палітычнай устаноўкі да 1950-х гг.

Яшчэ большай праблемай для Ерэвана стала ўзнікненне ў 1923 г. адміністрацыйнай адзінкі для савецкіх курдаў у складзе Савецкага Азербайджана. Гэта дэ факта азначала замацаванне за Азербайджанам паўнамоцтваў апекавацца справамі курдскай меншасці ў СССР. Курдыстанскі павет быў створаны на стужцы зямлі паміж Арменіяй і Нагорна-Карабахскай аўтаномнай вобласцю (НКАВ) Азербайджана, якую армянскі істэблішмент намагаўся далучыць да Арменіі. Рашэнні аб стварэнні НКАВ і Курдыстана былі прыняты дзяржаўнымі і партыйнымі органамі Азербайджана амаль адначасова – 7 і 16 ліпеня 1923 г., што ўказвае на стратэгічную логіку. Адсутнасць адміністрацыйнай мяжы з НКАВ перашкаджала яго магчымай перадачы Арменіі, але магчымае перападпарадкаванне Курдыстанскага павета Арменіі давала надзею армянскім уладам і на перадачу НКАВ. Прыкладам такое перадачы можа быць Кара-Калпакская аўтаномія, якая ў 1925–1932 гг. перадавалася двойчы паміж Казахстанам, РСФСР і Узбекістанам.

Дзеля гэткай перадачы Арменіі трэба было выбудаваць сувязі з курдскай меншасцю і Ерэван працягнуў падтрымку курдскай адукацыі і культуры. п рыкладам, навучальныя ўстановы для курдаў у абедзвюх рэспубліках засноўваліся практычна адначасова: курдскае аддзяленне педагагічнага тэхнікума ў Шушы і Закаўказскі курдскі педагагічны тэхнікум ў Ерэване [6, с. 55-56]. Неўзабаве Арменія пачынае весці рэй: у 1921-1938 гг. у Арменіі было выдадзена 148 кніг (агульным накладам 259 900 ас.) на курдскай мове, а ў Азербайджане – толькі 27 назваў (42 000 ас.) [7, с. 23-51]. У сакавіку 1930 г. ЦК КП (б) Арменіі далучыў да спісу сваіх СМІ штотыднёвік на курдскай мове “Рйа Таза” (Новы шлях). Яе першымі рэдактарамі былі армяне з былой Турэцкай Арменіі, якія ведалі курдскую мову, і толькі ў 1934 г. іх змяніў курд Джэрдо Генджо.

Трэба сказаць, што ўвогуле сярод савецкіх экспертаў па курдскіх пытаннях, якія былі этнічнымі курдамі, большасць ужо тады склалі езіды з Турэцкай Арменіі (напрыклад, Араб Шамілаў, Канат Курдоеў і Саманд Сіябандаў). Двое першых кансультавалі савецкія саюзныя органы па курдскіх пытаннях, захоўваючы повязі з уладамі Савецкай Арменіі і лабіруючы яе інтарэсы, а Сіябандаў займаў важныя пасады ў Савецкай Арменіі. Дзякуючы ранняму пачатку курдскіх культурных праектаў пры падтрымцы Арменіі, курды-езіды хутка распрацавалі лацінскі алфавіт для ўсіх савецкіх курдаў, які потым стаў стандартным. Спроба азербайджанскіх экспертаў увесці альтэрнатыўны алфавіт, бліжэйшы да азербайджанскага, амаль адразу правалілася.

Бачачы поспехі Арменіі ў збліжэнні з курдамі і разумеючы рызыку

перадачы Курдыстана і Нагорнага Карабаха Арменіі, Азербайджан скасаваў Курдыстанскую акругу ў 1930 г. Сутыкненне Азербайджана з Арменіяй па курдскім пытанні вяло нават да зрыву найважнейшых культурных мерапрыемстваў: у 1934 г. у Ерэване была праведзена першая канферэнцыя па арфаграфіі, другая, прызначаная на 1935 г., у Баку ніколі не адбылася. Колькасць курдаў у Азербайджане ў канцы 1930-х гг. рэзка скарацілася (з амаль 50 тыс. у 1926 г. да 6 тыс. у 1939 г.), што звязана з рашэннем уладаў Азербайджана дамагчыся перагляду афіцыйнай нацыянальнай прыналежнасці курдаў і зліквідаваць тым самым аснову для курдскай аўтаноміі.

Улады не толькі Азербайджану, але і некаторых іншых саюзных рэспублік дзейнічалі мэтанакіравана і дзесяцігоддзямі працягвалі асіміляцыю меншасцяў. У аглядзе, падрыхтаваным Інстытутам гісторыі АН Азербайджанскай ССР у 1961 г., падкрэсліваўся "*добраахвотны характар зліцця шматлікіх этнічных груп Рэспублікі з этнічнымі азербайджанцамі*" пасля 1930 г. [8, с. 431]. Курды былі інтэграваны ў палітычнае, культурнае і грамадскае жыццё Арменіі, але не ў Азербайджане: самы знакаміты курдскі партыйны дзеяч Азербайджана Чынгіз Йылдырым быў расстраляны, а Сулейман Рахімаў, курдскі пісьменнік і старшыня Саюза пісьменнікаў Азербайджана (1939-1940 гг.), яго ўплывовасці дасягнуць не здолеў.

Скарачэнне Азербайджанам падтрымкі курдскіх праектаў было яго ўласным крокам і збольшага папярэднічала згортванню нацыянальнай палітыкі ў СССР ў канцы 1930-х гг. Пасля таго і палітыка Арменіі ў дачыненні да курдаў саслабла: у 1938 г. было спынена выданне "Рйа Таза" і кніг па-курдску. Некаторыя з курдскіх саюзнікаў Ерэвана ў савецкіх цэнтральных установах, якія лабіравалі ўдзел армян ў курдскай палітыцы СССР, такія як Шамілаў або Курдоеў, зазналі пераслед.

З канца 1930-х гг. Масква засяродзілася на падрыхтоўцы да вайны і скараціла пазітыўную дыскрымінацыю ў дачыненні да невялікіх этнічных груп СССР. Пасля нямецкага нападу ў 1941 г. савецкія войскі супольна з брытанскімі акупавалі Іран, у прыватнасці азербайджанскія і курдскія раёны. Саюзнікі былі занепакоеныя магчымым сутыкненнем з Турцыяй, у якім былі б закранутыя раёны, населеныя курдамі. Але цікавасць да курдскага пытання адрадзілася не адразу, і нешматлікія курдскія эксперты, якія перажылі рэпрэсіі, былі скіраваныя на германскі фронт і заставаліся там, пакуль сітуацыя на ім не палепшылася.

Савецкае ўварванне ў Іран павысіла значэнне Азербайджана ў савецкай курдскай палітыцы, бо азербайджанамоўныя эксперты былі больш эфектыўнымі ў курдскіх раёнах Ірана, дзе курды размаўлялі на мове сарані і прынамсі разумелі азербайджанскую мову, чым савецкія эксперты і курдскія інтэлектуалы Арменіі, якія валодалі мовай курманджы, малазразумелай

большасці іранскіх курдаў. Важную ролю ў прасоўванні тагачаснага сепаратысцкага руху ў Паўднёвым Азербайджане і Іранскага Курдыстана адыграў лідар Савецкага Азербайджана Мір-Джафар Багіраў. Абодва праекты пачаліся ў 1944 г., але рух за курдскую аўтаномію заставаўся кволым да прыходу з Іраку паўстанцаў Мустафы Барзані – яны сталі ўзброеным крылом прасавецкага курдскага руху і ўвогуле зрабілі магчымым стварэнне дэ факта залежнай ад Паўднёвага Азербайджана курдскай аўтаноміі – т.зв. Мехабадскай рэспублікі [9, p. 63]. Нездарма Баку быў абраны для падрыхтоўкі кадраў магчымай курдскай аўтаноміі, у т.л. вайсковых.

Савецкія войскі былі выведзеныя з Ірана на пачатку 1946 г., і неўзабаве курдская і паўднёваазербайджанская рэспублікі абрынуліся пад ударамі іранскага войска, але СССР працягнуў падтрымліваць курдскі рух. Большая частка адпаведнай палітыкі праводзілася з Баку. Пасля ўцёкаў Барзані і яго прыхільнікаў з Ірана яны апынуліся ў Савецкім Азербайджане пад наглядам тамтэйшых уладаў. У 1948 г. іранскія і іракскія курдскія актывісты правялі канферэнцыю ў Баку, каб абмеркаваць далейшыя планы, але пасварыліся з Багіравым і прасілі Маскву вывезці іх з Азербайджана [10, p. 136-138]. Але нават пасля ад’езду Барзані ў Цэнтральную Азію, Багіраву затрымаў у Баку многіх актывістаў.

Пасля смерці Сталіна Багіраў быў арыштаваны як “саўдзельнік Берыі” ў 1954 г. і пакараны смерцю. Гэта прывяло да паслаблення ролі Баку ў савецкай курдскай палітыцы. Адначасова, з сярэдзіны 1950-х гг. Арменія грала ўсё больш важную ў ёй ролю: у 1955 г., на фоне закрыцця азербайджанскай газеты “Савецкі Курдыстан”, зноў пачала выходзіць “Рйа Таза”, якая стала галоўнай газетай савецкіх курдаў.

Ерэван ніколі не пакідаў надзей павялічыць тэрыторыю Арменіі за кошт уключэння НКАВ. У часы хрушчоўскай “адлігі” гэтая задума магла быць увасобленая ў жыццё праз адраджэнне курдскай аўтаноміі, якая магла б стаць сувязным звяном паміж Арменіяй і Нагорным Карабахам. У 1958 г. армянскія курды на чале з Мамедам Бабаевым звярнуліся да кіраўніцтва КПСС з просьбай аб адраджэнні курдскай аўтаноміі ў Азербайджане, а ў 1963 г. аналагічную просьбу аб аднаўленні “курдскай аўтаномнай рэспублікі” ў Азербайджане накіравалі рэспубліканскім уладам у Баку. У афіцыйным адказе азербайджанскага кіраўніцтва на петыцыю падкрэслівалася малалікасць курдаў у рэспубліцы ў параўнанні з Арменіяй і адсутнасць аб’ектыўнай неабходнасці ды гістарычных падстаў для аўтаноміі. У 1961 г. кіраўніцтва Азербайджана даручыла Інстытуту гісторыі Акадэміі навук Азербайджанскай ССР падрыхтаваць кароткі агляд аб некаторых этнічных групах Азербайджана і колькасць курдаў ў Савецкім Азербайджане была пададзеная роўнай прыкладна 20 000 чалавек [8, с. 428–430]. Улады ў Баку разумелі наступствы магчымага абвастрэння курдскага пытання, асабліва ў кантэксце планаў Арменіі на НКАВ.

Між тым, улады Арменіі з сярэдзіны 1950-х гг. актывізавалі сваё ўзаемадзеянне і з замежнымі курдамі, чаму спрыялі адпаведныя сувязі армянскіх курдскіх навукоўцаў, у прыватнасці Каната Курдоева. У прыватнасці ён і яго калегі мелі дачыненне да захадаў, звязаных з вяртаннем Барзані і яго паплечнікаў у 1958 г. з СССР у Ірак і актывізацыяй курдскага руху там. Апроч таго, з 1950-х гг. Савецкая Арменія арганізоўвала масавыя "праграмы рэпатрыяцыі", у тым ліку з краін Блізкага Усходу, што забяспечыла ёй доступ у краіны з курдскім насельніцтвам. З часам у Ерэван паехалі замежныя езідскія лідары. У 1970-х гг. адна з найбуйнейшых іракскіх курдскіх узброеных груповак - Патрыятычны саюз Курдыстана – нават выбудавала дадатковы канал сувязі з СССР праз сваіх езідскіх чальцоў, звязаных з савецкімі езідамі. [9, p. 334, 342, 365] Гэтыя сувязі захоўваліся і ахаплівалі іншыя курдскія партыі: Рабочая Партыя Курдыстана з пачатку 1990-х гг. абапіралася на некаторых вядомых курдскіх актывістаў-езідаў у Расіі. Пасля распаду СССР Арменія пачала прапагандаваць асобную езідскую ідэнтычнасць.

Роля Савецкай Арменіі і Азербайджана ў кшталтаванні савецкай палітыкі датычна курдаў сведчыць пра відавочную ролю савецкіх нецэнтральных органаў улады, асабліва саюзных рэспублік у савецкай палітыцы. Дысцыпліна, субардынацыя і іерархія ўнутры дзяржаўных і паралельных партыйных структур СССР моцна перабольшаныя ў гістарыяграфіі, што склалася пераважна праз даследаванне дзейнасці цэнтральных структураў СССР. Адміністрацыйны хаос і беспарадак былі шырока распаўсюджаныя ў савецкай сістэме нават у тыя часы, якія ўважаюцца пікам сталінскай эпохі. Гэта даследаванне дэманструе, што наўрад ці можна казаць пра паслядоўную палітыку СССР ў дачыненні да курдаў. Адна з прычын, чаму гэта так, звязана з зацікаўленасцю і здольнасцю рэспублік Савецкага Саюза па-рознаму ўдзельнічаць у вырашаць пытанні, звязаныя з курдскай палітыкай.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Khalid A.* Making Uzbekistan: Nation, Empire, and Revolution in the Early USSR. Cornell University Press, 2015.

2. *Fedtke G.* Roter Orient. Muslimkommunisten und Bolschewiki in Turkestan (1917-1924). Wien, Köln, Weimar: Böhlau, 2020.

3. *Bailey N.* The Lord's Prayer in Northern Kurdish: Lexical and orthographic journeys since 1787 // Родной язык. 2021. № 2. С. 152-218.

4. *Щукин И.С., Щукина А.В.* Очерки Армянского нагорья // Землеведение. 1927. Т. XXIX. Вып. I-II. С. 5-50.

5. Цэнтральны дзяржаўны архіў гісторыка-палітычных дакументаў Санкт-Пецярбурга (ЦГАИПД СПб). Ф. 1728. Оп. 1-38. Д. 298298.

6. *Победоносцева-Кая А.О.* Культурная революция среди закавказских курдов: межреспубликанское соперничество в советской национальной политике // История повседневности. 2023. № 3 (27). С. 47-71.

7. *Алексанян Н.* (сост.) Библиография советской курдской книги (1921–1960). Ереван: Издательство Академии Наук Армянской ССР, 1962.

8. *Гасанлы Дж.П.* Советский Азербайджан: От оттепели к заморозкам (1959–1969). М.: Флинта, 2020.

9. *Talabani J.* Mudhakirāt al-rayis Jalāl Tālabāni: rihlatu sittūn ʿaman min jibali Kurdistan ila qasri al-Salām. al-Dār al-ʿarabiyyat li-l-ʿulūm nāširūn, 2018.

10. Mustafa Barzani and the Kurdish Liberation Movement, 1931-1961. New York: Palgrave Macmillan, 2003.